Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
«___» __________ В.Р.Языковіч
_________________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД-______/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ХАРАВЫ КЛАС

*Вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыплінедляспецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01*
*Народная творчасць (харавая музыка),*
*спецыяльнасці 1-18 01 01-01 02 Харавая музыка народная*

2020

Вучэбнаяпраграмаскладзенаўадпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01 01 2013, вучэбнага планаўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка)

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*І.У.Канцэвіч,* выкладчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*Л.Л. Ражкова,*загадчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,кандыдат педагагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*кафедра* кампазіцыіўстановы адукацыі«Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;

*І.К.Абразевіч,* галоўны хормайстар дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча», заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 18.01.2019);

*прэзідыумам*навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 20.02.2019)

Адказны за рэдакцыю: В.Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск:Л.Л. Ражкова

**ТЛУМАЧА[illegible] ЗАПІСКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне«Харавы клас» распрацавана для ўстаноў вышэйшайадукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках).

Вучэбная дысцыпліна «Харавы клас» з'яўляецца інтэграцыйнай дысцыплінай, пры вывучэнні якой удакладняюцца тэарэтычныя веды, фарміруюцца і развіваюцца практычныя навыкі, набытыя падчас вывучэння іншых вучэбных дысцыплін: «Пастаноўка голасу», «Дырыжыраванне» і вучэбных дысцыплін кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі «Хоразнаўства», «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Методыка работы з хорам», «Выканальніцкае майстэрства», «Беларуская народна-песенная творчасць», «Расшыфроўка беларускіх народных песень», «Харавая аранжыроўка», «Асновы камп'ютарнай аранжыроўкі», «Танец у народным хоры».

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Харавы клас» павінна забяспечыць фарміраванне наступных *кампетэнцый*:

САК -1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці;

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;

САК-6. Умець працаваць у камандзе;

САК-10. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю;

ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці;

ПК-25. Арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва;

ПК-26. Выступаць у якасці акцёра-выканаўцы ў прафесійных і аматарскіх музычных калектывах, драматычных тэатрах, музычных тэатрах, тэатрах-студыях, на радыё, тэлебачанні, у канцэртных установах;

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні харавых калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – сфарміраваць у будучага спецыяліста шэраг прафесійных і сацыяльна-асобасных кампе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэнцый: працаваць з крыніцамі рэпертуару і літаратурай па народнай творчасці, арганізоўваць этапы працэсу падрыхтоўкі і выканання мастацкіх твораў, падрыхтоўкі творчых выступленняў на канцэртных пляцоўках, удзельнічаць у харавых калектывах у якасці артыста-выканаўцы, быць сацыяльнаадаптаваным чалавекам, фарміраваць і аргументаваць прафесійную пазіцыю.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– удасканальваць вакальна-харавыя навыкі; навыкі спеваў у ансамблі;

– фарміраваць навыкі спеваў з элементамі танцавальных рухаў;

– узброіць навыкамі арганізацыйнай работы;

– развіць уменні і навыкі вакальна-харавой і мастацка-творчай работы з хорам;

– развіць навыкі работы з літаратурнымі крыніцамі;

– выхоўваць сцэнічныя паводзіны;

– выхоўваць маральныя якасці асобы, здольнай да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

*У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Харавы клас» студэнт павінен ведаць:*

– прынцыпы голасаўтварэння;

– вакальна-харавую структуру хору;

– класіфікацыю пеўчых галасоў, іх тэсітуру, дыяпазоны;

– асноўныя элементы харавой гучнасці ў хоры;

– сучасныя, класічныя стылявыя і традыцыйна-рэгіянальныя выканальніцкія прыёмы;

– асноўныя прыёмы кіравання хорам;

*умець:*

– выкарыстоўваць асноўныя элементы харавой гучнасці ў хоры на практыцы (падзяліць на харавыя партыі, стварыць ансамбль, дабіцца чысціні строю, выявіць і стварыць адпаведныя нюансы);

– карыстацца сучаснымі, класічнымі стылявымі і традыцыйна-рэгіянальнымі выканальніцкімі прыёмамі;

– выконваць народную песню з элементамі руху;

– карыстацца асноўнымі прыёмамі ўпраўлення хорам;

*валодаць:*

– метадамі арганізацыі і стварэння мастацкіх калектываў;

– навыкамі ўпраўлення аматарскім і прафесійным хорам;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– навыкамі рэпетыцыйнай работы на розных этапах засваення музычнага твора;

– элементамі народнай харэаграфіі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Харавы клас» адведзена ўсяго 1312 гадзін, з якіх 792 гадзіны – аўдыторныя (практычныя) заняткі. Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБ МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Роля вучэбнай дысцыпліны «Харавы клас» у фарміраванні і станаўленні артыста-выканаўцы, мастацкага кіраўніка калектыву, хормайстра, удасканаленні і паглыбленні спецыяльных ведаў, развіцця творчых навыкаў.

## Раздзел І. Прафесійныя навыкі артыста хору

### *Тэма 1. Развіццё навыкаў народнай манеры спеваў*

Народная манера спеваў як комплекс вакальна-тэхнічных прыёмаў, якія склаліся пад уплывам традыцыйнага народнага выканальніцтва.

Авалоданне адзінай манерай спеваў у харавым калектыве.

Развіццё і ўдасканаленне пеўчага дыхання ў залежнасці ад характару мастацкага твора, спеваў у грудным і галаўным рэгістрах, натуральнага рэзаніравання голасу, дасканалага інтанавання.

Фразіроўка, агогіка, акцэнты, сэнсавыя націскі як сродкі перадачы музычна-паэтычнага тэксту.

### *Тэма 2. Навыкі спеваў у складзе невялікіх гуртоў*

Ансамблевае гучанне галасоў невялікага гурта.

Авалоданне навыкамі спеваў у розных формах выканальніцтва (дуэты, трыа, квартэты, квінтэты).

Дыкцыя, дыханне, строй, тэмбральная афарбоўка ў ансамблевых спевах.

Работа над харавым рэпертуарам у складзе ансамбля.

### *Тэма 3. Прыёмы народна-харавога выканання*

Выпрацоўка адзінай манеры гукаўтварэння.

Адзіная манера спеваў і яе ўплыў на элементы харавой гучнасці.

Пеўчае дыханне – аснова гучання мастацкага твора. Прынцыпы ланцуговага дыхання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізацыя слыхавой увагі спевака ў хоры (карэкцыйнай і выканальніцкай).

*Тэма 4. Культура выканання народнай песні*

Калектыўнае стварэнне мастацкага вобраза праз агульнае ўспрыманне і перадачу драматургіі мастацкага твора.

Развіццё навыкаў выразных харавых спеваў. Выразнае вымаўленне тэксту, дакладнае інтанаванне, фразіроўка, гукавядзенне, дынаміка.

Правілы сцэнічных паводзін удзельніка хору.

## Раздзел II. Станаўленне прафесійнага выканаўцы народнай песні ў складзе харавога калектыву

*Тэма 5. Удасканаленне і развіццё вакальна-харавых і выканальніцкіх навыкаў у залежнасці ад жанру і стылю мастацкіх твораў*

Аўтэнтычныя спевы. Засваенне рэгіянальных прыёмаў выканання, меладычных і моўных асаблівасцей. Спевы ў суправаджэнні традыцыйных народных інструментаў.

Стылізаваныя спевы. Развіццё навыкаў выканання беларускіх народных песень у апрацоўках кампазітараў a cappella і з суправаджэннем. Набыццё навыкаў выканання аўтарскіх твораў.

Спевы ў суправаджэнні народных інструментаў. Склад інструментальнай групы і яе выкарыстанне ў народна-харавых калектывах.

Выкарыстанне фанаграмы ў сучасных умовах выканальніцкай дзейнасці.

*Тэма 6. Элементы харавой гучнасці і сродкі мастацкай выразнасці як аснова для раскрыцця мастацкага вобраза*

Харавы ансамбль: вакальны, гукавышынны, дынамічны, дыкцыйны, метрарытмічны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Строй у народным хоры. Засваенне асаблівасцей ладагарманічнай і рытмічнай арганізацыі песень. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі.

Характар гукавядзення ў харавых творах. Legato, nonlegato, staccato ў залежнасці ад характару твора і трактоўкі паэтычнага тэксту.

Дыкцыя як адзін з важных сродкаў народна-выканальніцкага майстэрства.

Метр, рытм, поліметрыя ў народных песнях. Засваенне прыёмаў выканання складаных метрычных і рытмічных рысункаў у партытурах.

Фермата, цэзура, паўза як сродкі музычнай выразнасці.

*Тэма 7. Авалоданне навыкамі імправізацыі ў народным хоры*

Роля імправізацыі падчас выканання народнай песні.

Развіццё пеўчых навыкаў імправізацыі.

Спевы «з падводкай», спевы «з пералівамі», бурдон, канон, шматгалоссе, гамафонна-гарманічныя спевы.

*Тэма 8. Раскрыццё мастацкага вобраза сродкамі сцэнічнай выразнасці*

Арыентацыя ў сцэнічнай прасторы. Гібкасць паводзін на сцэне. Выразнасць корпуса, рук, галавы пры выкананні мастацкіх твораў.

Авалоданне навыкамі акцёрскага майстэрства для выразнага выканання народных песень і перадачы эмацыянальнага настрою, драматургіі мастацкага вобраза гледачам.

*Тэма 9. Сістэма распявання і яе спецыфіка для народнага пеўчага калектыву*

Роля распявання ў пеўчым выхаванні народнага спевака.

Спецыфіка практыкаванняў для народнага харавога калектыву. Прынцыпы падбору практыкаванняў.

Распяванне хору a cappella, пры дапамозе музычнага інструмента.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Асоба мастацкага кіраўніка ў народным хоры*

Роля мастацкага кіраўніка ў харавым калектыве.
Асноўныя задачы дзейнасці кіраўніка мастацкага калектыву.
Этапы работы мастацкага кіраўніка над харавым творам.

## Раздзел III. Работа мастацкага кіраўніка над рэпертуарам харавога калектыву

*Тэма 11. Арганізацыя этапаў падрыхтоўкі і працэсу выканання мастацкага твора*

Этапы работы мастацкага кіраўніка калектыву над харавым творам: падрыхтоўчая, рэпетыцыйная, выканальніцкая.

Асноўныя мэты і задачы падрыхтоўчай работы кіраўніка да вывучэння партытуры з хорам.

Асноўныя мэты і задачы кіраўніка ў працэсе рэпетыцыйнай работы з хорам па рэалізацыі мастацкай ідэі.

Асаблівасці канцэртнага выканання твора.

*Тэма 12. Анатацыя на мастацкі твор як сродак для дасканалага вывучэння харавой партытуры*

Асноўныя задачы пры разборы мастацкага твора.

Асноўныя раздзелы анатацыі: агульныя звесткі аб мастацкім творы і яго аўтарах, аналіз сродкаў музычнай выразнасці, вакальна-харавы аналіз, выканальніцкі аналіз.

*Тэма 13. Рэпетыцыйная работа мастацкага кіраўніка з хорам*

Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу ў мастацкім калектыве.

Мэты і задачы асноўных этапаў рэпетыцыйнай работы з харавым калектывам.

Складанне рэпетыцыйнага плана.

*Тэма 14. Работа мастацкага кіраўніка над харавой партытурай*

Агульнае знаёмства хору з творам. Тэхнічнае засваенне твора. Разбор музычнага тэксту. Асноўныя прыёмы і метады для вывучэння тэхнічна складаных эпізодаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Раскрыццё зместу мастацкага твора, яго эмацыянальнай і вобразнай сутнасці. Асноўныя прыёмы работы над сродкамі выканальніцкай выразнасці.

*Тэма 15. Работа над народнымі песнямі з элементамі танцавальных рухаў*

Выкарыстанне элементаў беларускага народнага танца ў час выканання народнай песні. Спецыфіка сцэнічнага ці бытавога выканання народных песень разам з элементамі руху.

Навыкі выканання харавога твора разам з танцавальнымі рухамі.

Асноўныя элементы беларускага народнага танца.

Сцэнічная інтэрпрэтацыя харэаграфічнага фальклору.

Работа над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі.

*Тэма 16. Фарміраванне рэпертуару ў народным хоры*

Прынцыпы падбору рэпертуару, тэматычныя і жанравыя асаблівасці.

Узоры аўтэнтычнага фальклору, апрацоўкі народных песень, аўтарскія творы для народных харавых калектываў.

Складанне рэпертуару для тэматычных і справаздачных канцэртаў.

## Раздзел IV. Арганізацыйна-кіруючая работа з харавым калектывам

*Тэма 17. Работа над канцэртным выкананнем харавога твора*

Значэнне паэтычнага тэксту для поўнага раскрыцця драматычнай лініі, эмацыянальнага настрою і стварэння сцэнічных вобразаў.

Знешні воблік, эмацыянальны настрой і сцэнічныя паводзіны –важныя складальнікі канцэртных нумароў.

Элементы харавой гучнасці і сродкі музычнай выразнасці ў канцэртным выкананні харавога твора.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 18. Работа над канцэртнай праграмай*

Сістэма работы кіраўніка калектыву над канцэртнай праграмай.

Падрыхтоўка сцэнарнага плана канцэртнага выступлення.

Асаблівасці канцэртнага выканання харавых твораў a cappella, у суправаджэнні аркестра народных інструментаў, фанаграм -1.

*Тэма 19. Падрыхтоўка харавога калектыву да канцэртнага выступлення*

Канцэртныя выступленні як шлях да прафесійнага росту народна-песенных калектываў.

Расстаноўка калектыву на сцэнічнай пляцоўцы. Сцэнаграфія.

Работа з акустычнымі асаблівасцямі канцэртнай залы. Асаблівасці работы з мікрафонамі.

Псіхалагічная падрыхтоўка ўдзельнікаў калектыву да канцэрта.

*Тэма 20. Арганізацыя гастрольна-канцэртнай дзейнасці харавога калектыву*

Менеджмент канцэртнай дзейнасці.

Асаблівасці і тэхналогіі арганізацыі канцэртнай дзейнасці харавога калектыву.

Арганізацыя гастрольнай дзейнасці. Нарматыўная база па арганізацыі гастрольна-канцэртнай дзейнасці.

Асаблівасці фестывальнай дзейнасці харавога калектыву.

*Тэма 21. Падрыхтоўка праграмы дзяржаўнага экзамену*

Складанне канцэртнай праграмы. Складанне сцэнарнага плана.

Выкарыстанне ў сваёй творчай дзейнасці разнастайнага музычна-стылістычнага матэрыялу.

Асноўныя прынцыпы рэжысуры канцэртнай праграмы: ідэя, развіццё агульнай драматычнай лініі (завязка, кульмінацыя, фінал), выкарыстанне харэаграфіі, мультымедыйных сродкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | практычныя | | |
| ***Уводзіны*** | 2 | | |
| **Раздзел I. Прафесійныя навыкі артыста хору** | | | |
| *Тэма 1.* Развіццё навыкаў народнай манеры спеваў | 72 | 6 | здача партый |
| *Тэма 2.* Навыкі спеваў у складзе невялікіх гуртоў | 36 | 4 | здача партый |
| *Тэма 3.* Прыёмы народна-харавога выканання | 48 | 4 | здача партый |
| *Тэма 4.* Культура выканання народнай песні | 28 | 4 | канцэрт-эзамен |
| **Раздзел II. Станаўленне прафесійнага выканаўцы народнай песні ў складзе харавога калектыву** | | | |
| *Тэма 5.* Удасканаленне і развіццё вакальна-харавых і выканальніцкіх навыкаў у залежнасці ад жанру і стылю мастацкіх твораў | 34 | 6 | творчы паказ |
| *Тэма 6.* Элементы харавой гучнасці і сродкі мастацкай выразнасці як аснова для раскрыцця мастацкага вобраза | 58 | | |
| *Тэма 7.* Аваладанне навыкамі імправізацыі ў народным хоры | 8 | 6 | творчы паказ |
| *Тэма 8.* Раскрыццё мастацкага вобраза сродкамі сцэнічнай выразнасці | 60 | | |
| *Тэма 9.* Сістэма распявання і яе спецыфіка для народнага пеўчага калектыву | 4 | 8 | практычная работа з хорам, пісьмовая работа |
| *Тэма 10.* Асоба мастацкага кіраўніка ў народным хоры | 16 | | |
| **Раздзел III. Работа мастацкага кіраўніка над рэпертуарам харавога калектыву** | | | |
| *Тэма 11.* Арганізацыя этапаў падрыхтоўкі і працэсу выканання мастацкага твора | 10 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 12.* Анатацыя на мастацкі твор як сродак длядасканалага вывучэння харавой партытуры | 6 | 3 | пісьмовая работа |
| *Тэма 13.* Рэпетыцыйная работа мастацкага кіраўніка з хорам | 16 | 3 | рэпетыцыйны план |
| *Тэма 14.* Работа мастацкага кіраўніка над харавой партытурай | 60 | | |
| *Тэма 15.* Работа над народнымі песнямі з элементамі танцавальных рухаў | 90 | | |
| *Тэма 16.* Фарміраванне рэпертуару ў народным хоры | 12 | | |
| **Раздзел IV. Арганізацыйна-кіруючая работа з харавым калектывам** | | | |
| *Тэма 17.* Работа над канцэртным выкананнем харавога твора | 90 | | |
| *Тэма 18.* Работа над канцэртнай праграмай | 16 | | |
| *Тэма 19.* Падрыхтоўка харавога калектыву да канцэртнага выступлення | 50 | | |
| *Тэма 20.* Арганізацыя гастрольна-канцэртнай дзейнасці харавога калектыву | 14 | | |
| *Тэма 21.* Падрыхтоўка праграмы дзяржаўнага экзамену | 14 | | |
| **Усяго…** | **744** | **48** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Алексютович, Л. К.* Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Л. К. Алексютович ; под ред. М. Я. Гринблата. – Минск, 1978. – С. 28–37, 412–437.

*2. Виноградов, К. П.* Работа над дикцией в хоре / К. П. Виноградов. – М. : Музыка, 1967. – 147 с.

*3. Грамовіч, І. М.* Методыка работы з фальклорным гуртам : курс лекцый / І. М. Грамовіч, Л. В. Снапкова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 139 с.

*4. Гребенщиков, С. М.* Белорусская народно-сценическая хореография / С. М. Гребенщиков. – Минск, 1976. – С. 175–204.

*5. Гребенщиков, С.* Сценические белорусские народные танцы / С. Гребенщиков. – Минск, 1978. – С. 3–24.

*6. Живов, В. Л.* Хоровое исполнительство : Теория. Методика. Практика : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений / В. Л. Живов. – М. : Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2003. – 272 с.

*7. Левандо, П. П.* Анализ хоровой партитуры / П. П. Левандо. – Л. : Музыка, 1965. – 55 с.

*8. Мухаринская, Л. С.* Белорусская народная песня : историческое развитие / Л. С. Мухаринская. – Минск : Наука и техника, 1977. – 122 с.

*9. Мухарынская, Л. С.* Беларуская народная музычная творчасць / Л. С. Мухарынская, Т. С. Якіменка. – Мінск : Выш. шк., 1993. – 110 с.

*10.* Хоровой класс и практическая работа с хором : учеб. пособие для студентов муз. отд-ний пед. колледжей и вузов / сост.: И. А. Медведева, А. Н. Васильева. – Чебоксары : Чуваш. гос. пед. ун-т, 2014. – 149 с.

*11. Чесноков, П. Г.* Хор и управление им : учеб. пособие / П. Г. Чесноков. – Изд. 4-е, стер. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2015. – 199 с. : нот. ил.

*12. Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко. – Минск : Выш. шк., 1990. – 414 с.

*13. Шамина, Л. В.* Исполнительская интерпретация в народном хоре / Л. В. Шамина // Работа дирижера над хоровой партитурой. – М. : Музыка, 1985. – 175 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Батюк, И. В.* Современная хоровая музыка : теория и исполнение : учеб. пособие для вузов / И. В. Батюк. – Изд. 2-е, испр. и доп. – СПб. : Лань, 2015. – 211 с. : ноты.

2. *Дорофеев, А.* Организация и работа фольклорного коллектива / А. Дорофеев. – М. : Музыка, 1980. – 85 с.

3. *Корнеева, С. М.* Как зажигают «звёзды» / С. М. Корнеева. – СПб. : Питер, 2004. – 320 с.

4. *Корнеева, С. М.* Музыкальный менеджмент : учеб. пособие для студентов вузов / С. М. Корнеева. – М. : Юнити-Дана, 2006. – 303 с.

5. *Красовская, Ю.* Концертная жизнь народной песни / Ю. Красовская // Сов. музыка. – 1971. – № 4. – С. 12–15.

6. *Макарова, Е. А.* Технологии арт-менеджмента : пособие для работников культуры / Е. А. Макарова. – Минск : Змицер Колас, 2014. – 148 с.

7. *Осеннева, М. С.* Хоровой класс и практическая работа с хором : учеб. пособие для вузов по спец. 030700 – Муз. образование / М. С. Осеннева, В. А. Самарин. – М : Academia, 2003. – 188 с. : ноты.

8. *Самарин, В. А.* Хороведение и хоровая аранжировка : учеб. пособие для студентов муз.-пед. фак. высш. пед. учеб. заведений / В. А. Самарин. – М. : Academia, 2002. – 352 с. : нот. ил.

9. *Самарин, В. А*. Хороведение : учеб. пособие для студентов сред. муз.-пед. учеб. заведений / В. А. Самарин. – М. : Академия, 1998. – 199 с.

10. *Тульчинский, Г. Л.* Менеджмент в сфере культуры : учеб. пособие / Г. Л. Тульчинский. – СПб. : Лань, 2001. – 528 с.

*Рэпертуарныя зборнікі*

1. *Гром, У. М.* Зайграйце, музыкі : рэпертуарны зборнік для фальклорных калектываў. Ч. 2 / У. М. Гром. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – 155 с.

2. *Зяневіч, У. К.* Аранжыроўка беларускіх народных песень : вучэб.-метад. дапам. / У. К. Зяневіч ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 361 с.

3. *Зяневіч, У. К.* Беларуская народная песня : хрэстаматыя / У. К. Зяневіч. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – 148 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Дробыш, С. І.* Дырыжыраванне : хрэстаматыя для народнага хору / С. І. Дробыш, С. Ф. Войцік, Л. І. Холупава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 297 с.

5. *Дробыш, С. І.* «І песню родную люблю я...» : вучэб.-метад. дапам. / С. І. Дробыш, С. Ф. Войцік, Л. І. Холупава. – Мінск : Друкарня РУП «Промпечать», 2008. – 120 с.

6. *Дробыш, С. І.* Хрэстаматыя па дырыжыраванні народным хорам / С. І. Дробыш, С. Ф. Войцік, Л. М. Міхліна. – Мінск : Беларусь, 1991. – 143 с.

7. *Несцяровіч, Г. Д.* Ансамбль беларускай народнай песні : вучэб. дапам. / Г. Д. Несцяровіч, Л. І. Холупава, А. І. Дубавец. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 152 с.

8. *Сірата, М. В.* «Весялушкі» / М. В. Сірата. – Мінск : БелІПК, 1994.

9. *Сірата, М. В.* «Добры дзень вам, госці!» / М. В. Сірата. – Баранавічы : «Издатель В. А. Грушевский», 2007. – 51 с.

10. *Сірата, М. В.* «Шле вітанне вам беларускі хор» / М. В. Сірата. – Мінск : «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа, 1990. – 203 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

### Патрабаванні да пісьмовай работы па распяванні ў народным хоры

Пісьмовая работа адлюстроўвае звод вакальна-харавых практыкаванняў (не менш за 5) для распявання хору з нотнымі прыкладамі і з указаннем асноўных задач кожнага з прыкладаў:

– выпрацоўка роўнага, свабоднага гуку на апоры;

– развіццё плаўнага гукавядзення;

– развіццё рухомасці голасу;

– пашырэнне дыяпазону;

– развіццё навыкаў дыхання, работа над ланцужковым дыханнем;

– выпрацоўка адзінай манеры спеваў;

– выпрацоўка дакладнай дыкцыі і свабоды артыкуляцыйнага апарату;

– развіцццё навыкаў спеваў розных дынамічных адценняў, дынамікі.

Работа выконваецца на нотным аркушы фармату А4.

### Патрабаванні да напісання анатацыі

Мэтай напісання анатацыі з'яўляецца дасканалае вывучэнне харавой партытуры, падрыхтоўка студэнта да самастойнай хормайстарскай дзейнасці. Анатацыя складаецца з 4 раздзелаў: агульныя звесткі аб мастацкім творы і яго аўтарах ці апрацоўшчыках, аналіз сродкаў музычнай выразнасці, вакальна-харавы аналіз і выканальніцкі аналіз.

У кожным раздзеле трэба не проста рабіць канстатацыю складаных момантаў, а звяртаць увагу на працу хормайстра над імі.

*І раздзел. Агульныя звесткі аб мастацкім творы і яго аўтарах.*

Жанр мастацкага твора, арыгінальны паэтычны і музычны тэксты (да аўтарскай апрацоўкі), рэгіянальныя асаблівасці, стыль мастацкага твора і яго асаблівасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя этапы творчасці кампазітара (для аўтарскіх твораў) ці аўтара, які зрабіў апрацоўку на народную песню.

*II раздзел. Аналіз сродкаў музычнай выразнасці.*

Аналіз музычнай формы, меладыі, метрычныя і рытмічныя асаблівасці, асаблівасці ладавай структуры музыкі (танальны план), гарманічны аналіз, аналіз фактуры, тэмпу і дынамікі.

Музычна-тэарэтычны аналіз партытуры робіцца ў цеснай узаемасувязі з паэтычным тэкстам.

*III раздзел. Вакальна-харавы аналіз.*

У гэтым раздзеле выяўляюцца асноўныя выканальніцкія складанасці ў творы і вызначаюцца хормайстарскія прыёмы для работы над імі.

Вакальна-харавы аналіз уключае раскрыццё наступных паняццяў: тып і від хору; дыяпазоны харавых партый і хору; характар гукавядзення і атака гуку; вакальныя складанасці і складанасці строю, ансамблевыя складанасці (тэмпавы, дынамічны, рытмічны і іншыя віды ансамбля).

*IV раздзел. Выканальніцкі аналіз.*

Аналіз агульнавыканальніцкіх прыёмаў: тэмп, агогіка, дынамічныя адценні, фразіроўка, сродкі дасягнення кульмінацыі і інш.

Аналіз спецыяльна-выканальніцкіх прыёмаў: манера гукаўзнаўлення, тэмбр, выкарыстанне рэгістраў голасу, артыкуляцыя, цэзуры, дыханне, выразная падача тэксту, дыкцыя і інш.

## Патрабаванні да напісання рэпетыцыйнага плана

Рэпетыцыйны план – гэта пісьмовая работа, якая прадугледжвае этапы работы хормайстра з хорам у працэсе рэпетыцыі.

План рэпетыцыйнай работы ўключае: пастаноўку асноўных задач у рабоце з хорам над мастацкім творам, улік складаных момантаў, пошук рэпетыцыйных вакальна-харавых прыёмаў, якія будуць садзейнічаць эфектыўнасці рэпетыцыі, улік узроўню і тэхнічных магчымасцей хору. План рэпетыцыйнай работы павінен быць кароткім і дастаткова гібкім, што дазволіць студэнту-хормайстру хутка рэагаваць на сітуацыю і ўносіць змены ў работу рэпетыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі:

– залік;
– экзамен;
– творчыя паказы;
– пісьмовыя работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі вынікаў вучэбнай дзейнасці

**1 (адзін) –** няведанне харавых партый і тэксту, нявыкананае практычнае заданне, слабыя музыкальныя і вакальныя даныя, адсутнасць ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту, адмаўленне ад адказу.

**2 (два) –** дрэннае веданне вакальных партый і паэтычнага тэксту, адсутнасць навыкаў работы з хорам, наяўнасць шматлікіх памылак, адмаўленне ад адказу на большасць пытанняў па дысцыпліне, дрэнна выкананае практычнае і пісьмовае заданне.

**3 (тры) –** фрагментарнае веданне харавога рэпертуару, значныя памылкі ў выкананні харавых партый, дрэнная інтанацыя, невыразная дыкцыя, дрэннае валоданне пеўчым дыханнем, няведанне агульнай драматургіі харавога твора, няўмелае валоданне элементамі руху ў вакальна-харэграфічных кампазіцыях, адсутнасць выразнага эмацыянальнага выканання, няма навыкаў работы з харавым калектывам, практычныя заданні выкананы не ў поўным аб'ёме і са значнымі памылкамі, недастатковы аб'ём ведаў па дысцыпліне, няпоўныя адказы на пытанні.

**4 (чатыры) –** недастатковае валоданне вакальна-харавымі навыкамі, пасрэдныя вакальныя даныя, недастаткова яскравы тэмбр голасу, няўстойлівая інтанацыя, невыразная дыкцыя, няўменне правільна размяркоўваць пеўчае дыханне, недасканалае веданне харавога матэрыялу, павярхоўнае разуменне паэтычнага тэксту, агульнай драматургіі харавога твора, няўменне раскрыць мастацкі вобраз, слабае валоданне элементамі руху пры спевах, навыкі работы з хорам знаходзяцца на нізкім узроўні, неактыўны ўдзел у канцэртнай дзейнасці калектыву, практычныя заданні выкананы са значнымі памылкамі, недастатковы аб'ём ведаў па дысцыпліне, няпоўныя адказы на пытанні.

**5 (пяць) –** сярэднія вакальныя даныя, некаторыя недахопы тэмбру голасу, няўстойлівая інтанацыя, пэўныя дэфекты дыкцыі, няўмелае карыстанне ланцужковым дыханнем, недастатковая апора гуку, няўменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў, няўпэўненае выкананне меладычнай лініі сваёй партыі з наяўнасцю некаторых памылак, няўпэўненае выкананне дынамічных адценняў, недастатковае разу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менне паэтычнага тэксту, невыразнае ўвасабленне сцэнічнага вобраза, удзельнічае ў канцэртных выступленнях, навыкі работы з хорам знаходзяцца на невысокім узроўні, пасрэдныя веды арганізацыйна-кіруючай работы з харавым калектывам, практычныя заданні выкананы не ў поўным аб'ёме з памылкамі.

**6 (шэсць) –** пасрэдныя вакальныя даныя, некаторыя недахопы тэмбру голасу, няўстойлівая інтанацыя, некаторыя дэфекты дыкцыі, не зусім умелае карыстанне ланцужковым дыханнем, слабая апора гуку, недасканалае ўменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў, некаторыя памылкі пры выкананні сваёй партыі кожнага харавога твора, няўпэўненасць пры выкананні дынамічных адценняў, недастатковае разуменне паэтычнага тэксту і агульнай драматургіі харавога твора, недасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобраза, слабае валоданне элементамі руху пры выкананні харавых твораў, удзельнічае ў канцэртных выступленнях, навыкі работы з хорам знаходзяцца на невысокім узроўні, недастатковы аб'ём ведаў і навыкаў па арганізацыйна-кіруючай рабоце, практычныя заданні выкананы не ў поўным аб'ёме з памылкамі, недастатковыя адказы на пытанні па дысцыпліне.

**7 (сем)** – сярэднія вакальныя даныя, дастаткова яскравы тэмбр голасу, інтанацыя з невялікімі недахопамі, дастаткова добрая дыкцыя, нязначныя памылкі пры карыстанні пеўчым дыханнем, недастаткова добрая апора гуку, уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў, дастаткова добрае веданне сваёй партыі ў харавых творах, нязначныя памылкі пры выкананні дынамічных адценняў, разуменне паэтычнага тэксту і агульнай драматургіі харавога твора, не зусім дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобраза, нядрэннае валоданне элементамі руху пры спевах, удзельнічае ў канцэртных выступленнях, навыкі работы з хорам знаходзяцца на добрым узроўні, дастатковы аб'ём ведаў і навыкаў па арганізацыйна-кіруючай рабоце, практычныя заданні выкананы ў поўным аб'ёме з наяўнасцю некаторых памылак, добрыя адказы на пытанні па дысцыпліне.

**8 (восем)** – добрыя вакальныя даныя, яскравы тэмбр голасу, добрая інтанацыя, добрая дыкцыя, правільнае пеўчае дыханне, дастаткова добрая апора гуку, уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў, уменне спяваць у ансамблі з другімі харавымі партыямі, добрае веданне сваёй партыі ў ха-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

равых творах, уменне валодаць дынамічнымі адценнямі, правільнае разуменне паэтычнага тэксту і агульнай драматургіі харавога твора, правільнае ўвасабленне сцэнічнага вобраза, добрае валоданне элементамі руху пры спевах, дастаткова актыўна ўдзельнічае ў канцэртных выступленнях, навыкі работы з хорам знаходзяцца на высокім узроўні, добры аб'ём ведаў і навыкаў па арганізацыйна-кіруючай рабоце, практычныя заданні выкананы ў поўным аб'ёме, добрыя адказы на пытанні па дысцыпліне, дастатковыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ў рамках адукацыйнага стандарту.

**9 (дзевяць)** – выдатныя вакальныя даныя, яскравы тэмбр голасу, добрая інтанацыя, выразная дыкцыя, правільнае пеўчае дыханне, добрая апора гуку, уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў, уменне спяваць у ансамблі з другімі харавымі партыямі, дасканалае веданне сваёй партыі ў харавых творах, уменне выконваць усе дынамічныя адценні, правільнае разуменне паэтычнага тэксту і агульнай драматургіі харавога твора, дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобраза, выдатнае валоданне элементамі руху пры спевах, актыўна ўдзельнічае ў канцэртных выступленнях, навыкі работы з хорам знаходзяцца на высокім узроўні, высокі аб'ём ведаў і навыкаў па арганізацыйна-кіруючай рабоце, практычныя заданні выкананы ў поўным аб'ёме без памылак, выдатныя адказы на пытанні па дысцыпліне, поўныя, глыбокія, сістэматызаваныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ў рамках адукацыйнага стандарту.

**10 (дзесяць)** – выдатныя вакальныя даныя, яскравы тэмбр голасу, дасканалая інтанацыя, выразная дыкцыя, правільнае пеўчае дыханне, устойлівая апора гуку, уменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў, уменне спяваць у ансамблі з другімі харавымі партыямі, дасканалае веданне сваёй партыі ў харавых творах, дэталёвае валоданне ўсімі дынамічнымі адценнямі, правільнае, выдатнае разуменне паэтычнага тэксту і агульнай драматургіі харавога твора, творчы падыход да ўвасаблення сцэнічнага вобраза, выдатнае валоданне элементамі руху пры спевах, актыўна ўдзельнічае ў канцэртных выступленнях, навыкі работы з хорам знаходзяцца на высокім узроўні, выдатна і творча падыходзіць да хормайстарскай работы, высокі аб'ём ведаў і навыкаў па арганізацыйна-кіруючай рабоце, практычныя заданні выкананы ў поўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ёме без памылак з выкарыстаннем дадатковай літаратуры і творчым падыходам, свабоднае валоданне праграмным вучэбным матэрыялам, выкарыстанне ведаў, уменняў і навыкаў у незнаёмай сітуацыі, выдатныя адказы на пытанні па дысцыпліне, поўныя, глыбокія, сістэматызаваныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ў рамках адукацыйнага стандарту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ХАРАВЫ КЛАС**

*Вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне дляспецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01*
*Народная творчасць (харавая музыка),*
*спецыяльнасці 1-18 01 01-01 02 Харавая музыка народная*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк2020. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,78. Тыражэкз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ